Лабаноўскі Л. В.

# АПОШНЯЯ АТАКА

Настаўнік матэматыкі Беразяцкай сярэдняй школы Ісаак Фёдаравіч Ваксман у гады Вялікай Айчыннай вайны па закліку Радзімы ўзяў у рукі зброю і стаў на яе абарону. За праяўленыя гераізм і мужнасць яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Дзяцінства Ісаака прайшло ў доме, на адной з ціхіх вулачак Краснаполля ў сям'і, дзе было 9 дзяцей – школьнікаў. Ён быў ім усім і сябрам, і памочнікам, і дарадчыкам, яго меркаванне для аднагодкаў было самым аўтарытэтным. Ён вельмі любіў матэматыку і ўсе сябры, знаёмыя, бацькі ўяўлялі яго настаўнікам. Але здарылася так, што пасля заканчэння Кранспольскай дзесяцігодкі ў 1938 годзе Ісаак паехаў да сваякоў у Днепрапятроўск, там і застаўся, паступіўшы ў транспартны інстытут.

Увесь час цягнула яго ў родныя мясціны, і праз два гады Ісаак вярнуўся ў Краснаполле. Загадчык райана, куды звярнуўся Ісаак з просьбай накіраваць яго ў школу настаўнікам, з радасцю сказаў:

– Паедзеш у Беразякі. Там сярэдняя школа і якраз патрэбен настаўнік матэматыкі. Лепшай кандыдатуры я не бачу.

З галавой акунуўся ў працу Ісаак Фёдаравіч, урокі матэматыкі сталі самым цікавым для дапытлівых дзяцей, а яшчэ малады настаўнік умеў запаліць іскры да навукі ў сваіх вучняў.

Але перакрэсліла ўсе планы вайна. На развітанне Ісаак Фёдаравіч сказаў дзецям:

– Радзіма заве на барацьбу з ворагам, але я вярнуся да вас. І абавязкова з перамогай.

...Быў 1943 год. Ішла бітва за Днепр. Усцяж паўнаводнай ракі гітлераўцы стварылі глыбокаэшаламіраваны рубеж, спадзеючыся спыніць імклівае наступленне Чырвонай арміі. 333-й стралковай Сінельнікаўскай Чырванасцяжнай дывізіі загадана было на поўдзень ад Запарожжа фарсіраваць з ходу Днепр і авалодаць плацдармам на правым беразе.

26 лістапада 1943 года батарэя, якой камандаваў старшы лейтэнант І. Ф. Ваксман, пераправілася ў ліку першых, але вораг адкрыў ураганны агонь. Супраць артылерыстаў фашысты кінулі буйныя сілы пяхоты і танкі. Атакі следавалі адна за другой. Бой нарастаў. Трэба было любой цаной утрымаць плацдарм, каб забяспечыць байцам дывізіі фарсіраванне Дняпра.

– Агонь! – камандаваў Ваксман адзін раз за другім. Зямля дрыжала ад артылерыйскіх залпаў батарэі. У той дзень пад агнём праціўніка артылерысты адбілі 10 ярасных контратак праціўніка, падавілі 15 варожых агнявых кропак, знішчылі больш 100 гітлераўцаў. Фашыстам ніяк не ўдавалася разграміць батарэю. Старшы лейтэнант Ваксман

умела выкарыстоўваў рухомасць "саракапятак". Ён ужо меў багаты вопыт баёў за Сталінград, ваяваў на Доне, вызваляў левабярэжную Украіну. Грудзі яго ўпрыгожвалі ордэны Вялікай Айчыннай вайны II-й ступені і Чырвонай Зоркі.

Пасля невялікага зацішша немцы кінулі танкі супраць адважных воінаў.

– Батарэя, к бою! "Тыгры" справа!

І зноў грыміць кананада Яркім факелам успыхнуў галаўны танк, а астатнія павярнулі назад. Захлябнулася яшчэ адна контратака. Плацдарм працягваў утрымлівацца батарэяй, якой камандаваў камуніст старшы лейтэнант І. Ф. Ваксман, а тым часам дывізія разгарнулася ў баявыя парадкі, пераадольваючы водную пераправу праз Днепр. Кожную пядзю савецкай зямлі даводзілася адваёўваць ў азвярэлага ворага.

Асабліва цяжкім быў бой 19 снежня 1943 года непадалёку ад Запарожжа паміж сёламі Канеўскім і Мар’еўкай. Батарэя старшага лейтэнанта Ваксмана падтрымлівала агнём наступленне батальёна. Бой зацягваўся, скончыліся снарады, фашысты з шалёным крыкам кінуліся на пазіцыі артылерыстаў. Але і тады камандзір не разгубіўся. Ён схапіў аўтамат і з крыкам: "Уперад! За Радзіму!", – павёў у атаку байцоў-артылерыстаў. У гэтым баі загінуў адважны камандзір.

Неўзабавс прыбыло падмацаванне і плацдарм быў замацаваны.

За гэты подзвіг Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 22 лютага 1944 года старшы лейтэнант І. Ф. Ваксман удастоены звання Героя Савецкага Саюза (пасмяротна). Яму быў тады 21 год.

Настаўнік Ісаак Фёдаравіч Ваксман вярнуўся ў школу ў назве "Беразяцкая сярэдняя школа імя Героя Савецкага Саюза І. Ф. Ваксмана".

А ў райцэнтры, дзе ён нарадзіўся, устаноўлена мемарыяльная дошка і яго імем назвалі адну з цэнтральных вуліц. Імя настаўніка-героя працягвае жыць у справах краснапальчан.

**Лабаноўскі, Л. В. Апошняя атака / Л. В. Лабаноўскі // Вайна народная / Л. В. Лабаноўскі. — Мазыр, 2002. — С. 229—230.**